


VERTIGO
ISSUE 3
BILL WILLINGHAM
LAN MEDINA
STEVE LEIALOHA
September 2002
2.50
can 4.25
SUGGESTED FOR MATURE READERS
FABLES™
DIRECT SALES
vertigocomics.com
JJ




FABLES 3. September, 2002. Published monthly by DC Comics, 1700 Broadway, New York, NY 10019. POSTMASTER: Send address changes to FABLES, DC Comics Subscriptions, P.O. Box 0528, Baldwin, NY 11510. Annual subscription rate $30.00. Canadian subscribers must add $12.00 for postage and GST. GST # is R125921072. All foreign countries must add $12.00 for postage. U.S. funds only. Subscriptions to this title are offered only to readers who attest they are 18 years of age or older, or with written parental approval to readers under 18 years of age.
Printed in Canada.


DC Comics. Adivision of Warner Bros.–An AOL Time Warner Company


ПА-ПЕРШАЕ ТРЭБА РАССТАВІЦЬ УСЁ ГЭТА СМЕЦЦЕ, КАБ ПАЎТАРЫЦЬ-ПРЫ МАГЧЫМАСЦІ - ТОЕ, ЯК МЭБЛЯ БЫЛА РАСКІДАНА Ў ЯЕ.
ПОТЫМ ЗАБАЎЛЯЛЬНАЯ ЧАСТКА, ЯК Я І АБЯЦАЎ. ТУТ ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЯЛІКІ НЕПАРАДАК.
ВЫКАРЫСТАЙЦЕ ГЭТЫ ПАПЯРЭДНЕ ВЫМЕРАНЫЯ ПАКЕТЫ З КРЫВЁЙ І АДНАВІЦЕ МАЛЮНАК ПЫРСАК КРЫВІ Ў КВАТЭРЫ НАВЕРСЕ.
ДОБРА.
ЛІЧЫЦЕ ДАКЛАДНА КОЛЬКІ КРЫВІ ВЫ ВЫКАРЫСТАЛІ, КАБ ПАЎТАРЫЦЬ ТОЕ, ШТО НАВЕРСЕ. ТАДЫ МЫ ВЫСВЕТЛІМ, КОЛЬКІ КРЫВІ РУЖАНЬКІ БЫЛО НАСАМРЭЧ РАЗЛІТА.
ВЫКАРЫСТАЙЦЕ ГЭТЫЯ ФАТАГРАФІІ З МЕСЦА ЗЛАЧЫНСТВА, КАБ МАДЭЛЬ БЫЛА ЯК МАГА БОЛЬШ ДАКЛАДНАЙ.
КАЛІ ГЭТА БУДЗЕ САПРАЎДЫ НЕАБХОДНА, ПАДНІМІЦЕСЯ Ў КВАТЭРУ І ПАГЛЯДЗЕЦЬ САПРАЎДНАЕ МЕСЦА, АЛЕ НЕ ХАДЗІЦЕ ПА ДОКАЗАМ. І НЯХАЙ ДАПАМОЖА ВАМ БОГ, КАЛІ ХТОСЬЦІ З ЗВЫЧАЙНЫХ ВАС УБАЧЫЦЬ ЦІ КАЛІ ВЫ ЗАБУДЗЕЦЕСЯ ЗАЧЫНІЦЬ УСЁ.
ТРЭБА БОЛЬШ НА НІЖНІЯ ПАЛІЧКІ, МУХАЛОЎ.
"ПАСТУШОК СТАРЭЙШЫ, ТЭЛЕФАНУЙЦЕ МНЕ, КАЛІ СКОНЧЫЦЕ".



БУДЫНАК БУДЛЭНД У ЗАХОДНЯЙ ЧАСТЦЫ.
ЦІ ВЫ ЖАДАЛІ БАЧЫЦЬ МЯНЕ?
ПЕНТХАЎС – РЭЗІДЭНЦЫЯ КАРАЛЯ КОЎЛА, НЕАФІЦЫЙНАГА ПАЖЫЦЦЁВАГА МЭРА ФЭЙБЛТАЎНА.
ОХ, НАМ НЕ ПАТРЭБНЫЯ ФАРМАЛЬНАСЦІ, БЭЛА. НЕ ЗАРАЗ, КАЛІ ТУТ ТОЛЬКІ ТЫ І Я. ПРАХОДЗЬ.
ДЗЯКУЮ, СЭР. ШТО Я МАГУ ЗРАБІЦЬ ДЛЯ ВАС ГЭТАЙ РАНІЦАЙ?
МЯНЕ НЕПАКОІЦЬ ГЭТА НЕПРЫЕМНАЯ СІТУАЦЫЯ З ТВАЁЙ СЯСТРОЙ. ВЕЛЬМІ ТРАГІЧНАЯ, ЖАХЛІВАЯ СПРАВА. ЯК Я РАЗУМЕЮ, ТЫ ДАПАМАГАЕШ БОЗЛІ Ў РАССЛЕДАВАННІ?
ТАК, СЭР. Я ВЕДАЮ, ГЭТА НЕ ЗВЫЧАЙНЫ ПАРАДАК, АЛЕ Ў ГЭТАЙ СПРАВЕ Я ВЫРАШЫЛА, ШТО МАГЧЫМЫ ТАКІ ВАРЫЯНТ, УЛІЧВАЮЧЫ, ШТО ГЭТА МАЯ...
ТАК, ВЯДОМА. З ГЭТЫМ НІЯКІХ ПРАБЛЕМ. АБСАЛЮТНА ЗРАЗУМЕЛА. КРЭЎНЫЯ СВАЯКІ ПАВІННЫ ПРЫГЛЯДАЦЬ АДЗІН ЗА АДНЫМ. МЫ МОЖАМ І НЕ ДУМАЦЬ ПРА СПРАВЫ ДЗЕНЬ-ДРУГІ...
СЭР?


МНЕ ПАТЭЛЕФАНАВАЛІ ЎНАЧЫ.
З СКАРГАЙ. КАЛІ БЫЦЬ ДАКЛАДНЫМ – СІНЯЯ БАРАДА. КОЖНЫ ГОД-ШЧОДРЫ ФУНДАТАР, ЛІДАР СУПОЛЬНАСЦІ.
СЦВЯРДЖАЕ, ШТО ВЫ І СПАДАР ВОЎК АБВІНАВАЦІЛІ ЯГО. ЗАБОЙСТВА. УВАРВАЛІСЯ ДА ЯГО З КРЫКАМІ.
КАЛІ БЫЦЬ ДАКЛАДНАЙ – МЫ НЕ УРЫВАЛІСЯ ДА ЯГО. СІНЯЯ БАРАДА САМ НАС ЗАПРАСІЎ. АЛЕ АСТАТНЯЯ ЧАСТКА ПРАЎДЗІВАЯ. БОЗЛІ ВІНАВАЦІЎ ЯГО ГУЧНА Ў ЗАБОЙСТВЕ.
ЧАМУ?
Crunch MONKEY
НЕ УЯЎЛЯЮ. ГЭТА РАПТАМ ЗДАРЫЛАСЯ. НАСАМРЭЧ ЁН ТАКІМ ЧЫНАМ З ДЖЭКАМ З КАЗАК. ЯК МНЕ ЗДАЕЦЦА, АДЗІНАЙ СТРАТЭГІЯЙ БОЗЛІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ХАДЖЭННЕ АД АДНАГО ПАДАЗРОНАГА ДА ДРУГОГА І АБВІНАВАЧВАННЕ ІХ.
ЦІ НЕ ДУМАЕШ ТЫ, ШТО ЁН НЕ НА СВАІМ МЕСЦЫ? УРЭШЦЕ Ў БЫЛЫЯ ЧАСЫ ЁН НЕ БЫЎ ДЭТЭКТЫВАМ НА СТАРОЙ ЗЯМЛІ. ЗВЕР З САМЫХ ШАЛЁНЫХ. ЗАБОЙЦА. ЦІ НЕ ЗАНАДТА ДЛЯ ЯГО ГЭТА ПРАЦА?
ХТО ВЕДАЕ? ДАГЭТУЛЬ ЁН БЫЎ УЗОРАМ ПЕРАВЫХАВАННЯ.
ЯГО СПРАВА ЧЫСТАЯ З ЧАСОЎ АГУЛЬНАЙ АМНІСТЫІ. І Я НЕДАСТАТКОВА ВЕДАЮ ПРА ЯГО ДЭТЭКТЫЎНЫЯ ШТУКІ, КАБ АЦЭНЬВАЦЬ ЯГО ПРАЦУ.



«ПАКУЛЬ ШТО, БОЛЬШ ЦІ МЕНШ У ПАРАДКУ, МЫ ПАГУТАРЫЛІ З ДЖЭКАМ. ЯК ЯЕ ХЛОПЕЦ У ДАДЗЕНЫ МОМАНТ, ЁН БЫЎ НАШЫМ ПЕРШЫМ КАНДЫДАТАМ НА РОЛЬ ЗЛАЧЫНЦЫ».
Я НЕВІНАВАТЫ!
«ЁН СЦВЯРДЖАЕ, ШТО НЕ ВЕДАЕ НІЧОГА ПРА ЗНІКНЕННЕ РУЖЫ, АЛЕ Я НЕ ЎПЭЎНЕНА. АДНОЙЧЫ ЖУЛІК – ЖУЛІК НАЗАЎЖДЫ. ЗАРАЗ БОЗЛІ ПАКІНУЎ ЯГО АСТЫЦЬ У КАМЕРЫ ДЛЯ ЗАТРЫМАНЫХ У СКЛЕПЕ».
МАЖЛІВА ТЫ НІЧОГА І НЕ ЗРАБІЎ У ГЭТЫ РАЗ, ДЖЭК. АЛЕ ТЫ НІКОЛІ НЕ БЫЎ НЕВІНАВАТЫМ.
«ПОТЫМ МЫ ДАПЫТАЛІ СІНЕБАРОДА, ХОЦЬ ВЫ ЎЖО ЧУЛІ ЯК ЦУДОЎНА ГЭТА АДБЫЛАСЯ. Я ЛІЧУ, ШТО БОЗЛІ АБВІНАВАЦІЎ ЯГО ПРОСТА, КАБ СТРЭСЦІ З ЯГО ГЭТУ НАПЫШЛІВУЮ ПЫХУ, З ЯКОЙ ЁН ЗАЎСЁДЫ РАЗМАЎЛЯЕ КАЛЯ НАС, НІЖЭЙСТАЯЧЫМІ ГРАМАДЗЯНСКІМІ СЛУЖБОЎЦАМІ».
ЯК ВЫ АСМЕЛІЛІСЯ РАЗМАЎЛЯЦЬ СА МНОЮ ТАКІМ ЧЫНАМ?!
ХНЫК- -ХАЛЕРА- ХНЫК.
«ГЭТА ПАДЗЕЙНІЧАЛА, СІНЕБАРОД ЗДЗІВІЎ НАС ДАКУМЕНТАМ, ЯКІ БЕЗУМОЎНА ДАКАЗВАЕ, ШТО ЁН У ДАМОЎНАЙ ФОРМЕ ЗАРУЧАНЫ З РУЖАЙ, І ПАВІНЕН АЖАНІЦЦА НА ЁЙ АДРАЗУ ПАСЛЯ ДНЯ ПАМЯЦІ. Я ШЧЫРА СПАДЗЯЮСЯ, ШТО ДАМОВА ФАЛЬШЫЎКА, БО АМННІСТЫЯ ЦІ НЕ, АЛЕ Я НЕ МАГУ ПРОСТА ТАК ЗАБЫЦЬ, ШТО ЗДАРЫЛАСЯ З КОЖНАЙ З ЯГО БЫЛЫХ ЖОН».
НАВОШТА МНЕ ЗАБІВАЦЬ ЯЕ, КАЛІ МЫ БЫЛІ ЗАРУЧАНЫ?!
«У НАС ЁСЦЬ ТЭОРЫЯ НАКОНТ ЯГО, ЁН ПРЫРАЎНАВАЎ, КАЛІ РЫЖА КІНУЛА ЯГО, КАБ ВЯРНУЦЦА НАЗАД ДА ДЖЭКА, ТАМУ ЁН ЗРАБІЎ З ЁЙ СВАЮ ЖУДАСНУЮ РЭЧ, ЯКОЙ ЁН ВЯДОМЫ».
ПРАБЛЕМА ГЭТАГА СЦЭНАРА Ў ТЫМ, ШТО Ў МІНУЛЫМ ЯГО МОДУС АПЕРАНДЗІ СКЛАДАЎСЯ Ў ЗАБОЙСТВЕ ПАСЛЯ ВЯСЕЛЛЯ. У ШЛЮБНУЮ НОЧ, КАЛІ БЫЦЬ ДАКЛАДНАЙ.



ПОТЫМ МЫ ЗАЙШЛІ ДА ВЕДЗЬМЫ З ЧАРНАЛЕССЯ.
Я БЫЛА ПАСЛУХМЯНАЙ, ВОЎК.
ТАК, ТЫ ЧЫСТАЯ З ТЫХ ЧАСОЎ, ЯК ПРЫЕХАЛА Ў ГОРАД.
АЛЕ Я НЕ МАГУ НЕ ПАДУМАЦЬ ПРА ТВАЕ БЫЛЫЯ ПРЫХІЛЬНАСЦІ Ў ЕЖЫ!
ШТО АДКАЖАШ, БАБУЛЯ?! НАДАКУЧЫЛА ЕСЦІ ІМБІРНЫЯ ПЕРНІКІ?!
МІНУЛАЙ НОЧЧУ МЫ СУСТРЭЛІСЯ З МАІМ БЫЛЫМ МУЖАМ, З ЦУДОЎНЫМ ПРЫНЦАМ, У КАРЧМЕ "БРЭНСТОК". БОЗЛІ АДВЁЎ ЯГО Ў БОК, Я РАЗМОВЫ НЕ ЧУЛА. АЛЕ ЯНА НЕ ВЫГЛЯДАЛА ДОБРАЗЫЧЛІВАЙ.
ТВОЙ РАСПЕШЧАНЫ СТЫЛЬ ЖЫЦЦЯ ПАХІСНУЎСЯ, КАЛІ СНЕЖКА ПАДЛАВІЛА ЦЯБЕ Ў ЛОЖКУ З ЯЕ СЯСТРОЙ.
МЫ - ТЫ І Я - ВЫДАТНА ВЕДАЕМ, ШТО ТЫ ЗАНАДТА ЭГАІСТЫЧНАЯ ДУПА, КАБ ВІНАВАЦІЦЬ СЯБЕ Ў МНОСТВЕ ПАМЫЛАК , ТАМУ ТЫ І ВІНАВАЦІЎ РУЖУ! ТЫ ЎВЕСЬ ЧАС ВАСТРЫЎ НОЖ НА ЯЕ?
ЯНА ЗНІКЛА ПРАЗ НЕКАЛЬКІ ДЗЁН ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ТЫ ВЯРНУЎСЯ Ў ГОРАД. СУПАДЗЕННЕ, А?
ТЫ НУДНЫ І МАЛЕНЬКІ ЧАЛАВЕЧАК. ТАБЕ ТРЭБА ЧАСЦЕЙ МЫЦЦА.





І РАНЕЙ ЦІ ПАЗНЕЙ, КАРОЛЬ КОЎЛ, ВЫ ДАВЕДАЕЦЕСЯ, ШТО БОЗЛІ ЛІЧЫЦЬ ПАДАЗРОНАЙ І МЯНЕ.
ЁН ПРАВЁЎ ДОПЫТ УЧОРА НОЧЧУ.
Я НАВАТ НЕ ЎЯЎЛЯЮ, ЦІ ЗРАБІЎ ЁН З ГЭТАЙ РАЗМОВЫ ВЫСНОВЫ.
ТЫ І ТВАЯ СЯСТРА НЕ НАДТА СЯБРАВАЛІ Ў АПОШНІ ЧАС.
ШТО АГУЛЬНАВЯДОМА ЎЖО ГАДЫ. КАЛІ Б Я ЯЕ САПРАЎДЫ ДАСТАТКОВА НЕНАВІДЗЕЛА КАБ ЗАБІЦЬ, НАВОШТА МНЕ БЫЛО ЧАКАЦЬ, КАБ ЗРАБІЦЬ ГЭТА?
ТАМУ ШТО ДАГЭТУЛЬ ТЫ НЕ БЫЛА ДРУГОЙ ПЕРСОНАЙ У КІРАЎНІЦТВЕ ФЭЙБЛТАЎНА. І ТЫ НЕ МЕЛА МАГЧЫМАСЦІ ВЫКАРЫСТАЦЬ СВАЮ ПАЛІТЫЧНУЮ ВАГУ ДЛЯ ПРЫКРЫЦЦЯ СЛЯДОЎ.
НАСУПЕРАК МАЙМУ ЖАДАННЮ, ТЫ ЗАЛЕЗЛА Ў МАЁ РАСЛЕДАВАННЕ І МАЕШ ПРАВА ЗВОЛЬНІЦЬ МЯНЕ, КАЛІ Я ПАДЫЙДУ ЗАНАДТА БЛІЗКА. ДОБРАЯ ПЕРАВАГА ДЛЯ ЗАБОЙЦЫ.
АГА. Я ЎЛІЧУ ГЭТА, КАЛІ ЗБЯРУСЯ КАЛІ-НЕБУДЗЬ ЗАБІЦЬ КАГОСЬЦІ.
"НАПРЫКАНЦЫ БОЗЛІ ЗАЎВАЖЫЎ, ШТО НАМ НЕ ТРЭБА ЗАБЫВАЦЬ ПРА ВОРАГА. ЯГО КРЫВАВЫ ЗАВАЁЎНІЦКІ ПАХОД ПА КАЗАЧНЫМ ЗЕМЛЯМ МАГЧЫМА НЕ СКОНЧЫЎСЯ, ПАСЛЯ ТАГО ЯК НЕКАТОРЫМ З НАС АТРЫМАЛАСЯ ЗБЕГЧЫ Ў СВЕТ ЗВЫЧАЙНЫХ.
МАГЧЫМА НЕКАТОРЫЯ З ЯГО АГЕНТАЎ ПАЙШЛІ ЗА НАМІ, КАБ ПРАЦЯГНУЦЬ ВАЙНУ СУПРАЦЬ НАС?"


ДРЭННЫЯ СПРАВЫ, СПАДАРЫНЯ СНЕЖКА. ЖАХЛІВА НАВАТ ДУМАЦЬ. АЛЕ ЎСЁ Ж НАВАТ ПЕРАД ТВАРАМ ТАКОЙ ТРАГЕДЫІ, МЫ НЕ ПАВІННЫ ЗАБЫВАЦЬ ПРА ДРУГІЯ ПЫТАННІ.
ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ ІЗНОЎ БЛІЗКА НАВІС НАД НАМІ. ТРЭБА ПРА ЯГО ТАКСАМА ДУМАЦЬ, ТАК? ЦІ МАГЧЫМА НЕЯК ВЫРАШЫЦЬ ПЫТАННЕ ДА СВЯТА?
Я НЕ МАГУ АБЯЦАЦЬ...
ФЭЙБЛТАУН – НАЙВАЖНЕЙШАЯ АДКАЗНАСЦЬ, ТВАЯ І МАЯ. ГЭТА ЎСЁ НА НАШЫХ ПЛЯЧАХ. ГЭТА ВЫСАКАРОДНЫ ЭКСПЕРЫМЕНТ, АЛЕ ДАЛІКАТНЫ. НЕТРЫВАЛЫ, СТВОРАНЫ З ДЗЯСЯТКА СВАРАК І З СОТНЯЎ СТАРЫХ КРЫЎД.
ЁН МОЖА ЛЁГКА РАЗВАЛІЦЦА З-ЗА ГЭТАГА ВЫПАДКА.
Я РАЗУМЕЮ ГЭТА, СЭР, АЛЕ...
ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ – ГЭТА БОЛЕЙ ЧЫМ ВЕЧАРЫНА. ГЭТА МОМАНТ, КАЛІ МЫ АТРЫМЛІВАЕМ БОЛЬШУЮ ЧАСТКУ ЎКЛАДАННЯЎ – НАШАГА ПРАЦОЎНАГА БЮДЖЭТА НА НАСТУПНЫ ГОД.
І КАШАЛЬКІ ЗАЧЫНЯЦЦА НАСТОЛЬКІ, НАКОЛЬКІ БУДЗЕ СТРАЧАНА УПЭЎНЕНАСЦЬ У НАШЫМ МАЛЕНЬКІМ УРАДЗЕ, ЗРАЗУМЕЛА?
ДУМАЮ, ТАК.
ВЯДОМА, ТЫ РАЗУМЕЕШ. ТЫ РАЗУМНАЯ. ТЫ ВЫРАШЫШ УСЕ ПЫТАННІ. РАБІ, ШТО ТРЭБА, АЛЕ КАБ ГЭТА ПЫТАННЕ БЫЛО ВЫРАШАНА ДА БАЛЮ.



Я ГАТОВЫ. ПАДНОС, КАЛІ ЛАСКА.
ТРЫМАЮ. ДЗЯКУЙ. ЦІ МОЖАШ АДЧЫНІЦЬ ДЗВЕРЫ?
`ДОБРАГА ПАЛЯВАННЯ, СЭР.


КАРОЛЬ КОЎЛ ЗДЗІВІЎ МЯНЕ.
ЁН ЗМОГ ЗТРЫМЛІВАЦЦА АМАЛЬ ДВА ДНІ ПЕРАД ТЫМ ЯК НАЦІСНУЦЬ НА МЯНЕ, КАБ Я ВЫРАШЫЎ ПЫТАННЕ.
ДЗЕ ТЫ ЎЗЯЎ УСЁ ГЭТА?
З КВАТЭРЫ ДЖЭКА. ТОЛЬКІ СКОНЧЫЎ ТАМ ПЕРАТРУС. ТАМ ШМАТ КАМП'ЮТАРАЎ. ПРЫНАМСІ ШЭСЦЬ ПАЎНАВАРТАСНЫХ СІСТЭМ. Я ЗАБРАЎ АДНУ, КАБ ТЫ ЗМАГЛА ПАКАПАЦЦА І ВЫСВЕТЛІЦЬ, ЧЫМ ЁН ЗАЙМАЎСЯ.
ЧАМУ Я? ЧАМУ ТЫ САМ ГЭТА НЕ ЗРОБІШ?
ТАМУ ШТО Я НЕ МАГУ КАРЫСТАЦЦА ЎСІМ ГЭТЫМ. МАШЫНЫ МЯНЕ НЕНАВІДЗЯЦЬ. Я ЛУДЫТ НА ГЕНЕТЫЧНЫМ УЗРОЎНІ, НЕ МАГУ КАРЫСТАЦЦА ЧЫМСЦІ СКЛАДАНЕЙ ТОСТАРА.
А ШТО ТЫ ЗБІРАЕШСЯ РАБІЦЬ, КАЛІ Я БУДУ ВЫКОНВАЦЬ РАБОТУ ДЛЯ ЦЯБЕ?
ЁСЦЬ СПРАВЫ. У ДЖЭКА АБЕДЗЕННЫ ЧАС, ТАМУ ПАЙДУ НАВЕДАЮ ЯГО. І МНЕ ТРЭБА ЎСЁ ЯШЧЭ ВЫСВЕТЛІЦЬ НЕКАЛЬКІ ДЭТАЛЕЙ ПА СПРАВЕ.
ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ, ШТО СПРАВА АМАЛЬ ВЫКРЫТА?


АГА. Я ВЫКРЫЎ БОЛЬШУЮ ЧАСТКУ ЯШЧЭ Ў ПЕРШУЮ ГАДЗІНУ. Я ЎЖО ШМАТ ВЕДАЮ ПРА ТОЕ, ШТО АДБЫЛОСЯ. І БОЛЬШУЮ ЧАСТКУ ТАГО ЯК, АЛЕ Я ЎСЁ ЯШЧЭ ЧАСТКОВА НЕ ВЕДАЮ ХТО І ЧАМУ.
І КАЛІ МЕНАВІТА ТЫ ЗБІРАЎСЯ ЎВЕСЦІ МЯНЕ Ў КУРС СПРАВЫ?
КАЛІ Я БУДУ ЎПЭЎНЕНЫ, ШТО ГЭТА НЕ ТЫ ЗЛОДЗЕЙ У ГЭТАЙ ЗАГАДЦЫ.
ХОЦЬ БЫ АДКАЖЫ, ЦІ ЖЫВАЯ ЯНА?
ПАБАЧЫМ.
ТЫ БЫВАЕШ ДАХАЛЕРЫ РАЗДРАЖНЯЛЬНЫМ КУРВІНЫМ СЫНАМ!
У МАІМ ВЫПАДКУ ЛІТАРАЛЬНА, АЛЕ ЯНА БЫЛА КЛАПАТЛІВАЙ І ЛЮБІЛА МЯНЕ. ЛЕПШАЯ МАЦІ, ПРА ЯКУЮ МОЖА МАРЫЦЬ ЛЮБЫ ХЛОПЧЫК.
КАЛІ ТЫ ЗБІРАЕШСЯ ПАБАЧЫЦЦА З ЦУДОЎНЫМ ПРЫНЦАМ?
НІКОЛІ БУДЗЕ ДОБРА. А ШТО?
ТАМУ ШТО Я ЖАДАЮ ДАПАМАГЧЫ ЯМУ ПРАДАЦЬ ТЫТУЛ, АЛЕ НЕ ЗУСІМ ТАК, ЯК ЁН ЖАДАЕ.
ЧАМУ ТЫ КЛАПОЦІШСЯ ПРА ГЭТА? ШТО ТЫ НАДУМАЎ?
ВАР'ЯЦКАЯ І НЕЙМАВЕРНАЯ СХЕМА, КАБ УСЁ БЫЛО ВЫКРЫТА Ў КАНЦЫ, БЕЗ ЛІШНЯГА КРОВАПРАЛІЦЦЯ. І ТОЛЬКІ МАГЧЫМА, ШТО КАЗАЧНАЯ СУПАЛЬНАСЦЬ НЕ БУДЗЕ ПРЫ ГЭТЫМ ЗНІШЧАНА.
АЛЕ "МАГЧЫМА" НЕ ПАДЫХОДЗІЦЬ.


У БУДЫНКУ, ДЗЕ ЗНАХОДЗІЦЦА КВАТЭРА РУЖЫ...
НЕЕЕ, МУХАЛОЎ, УВАЖЛІВЕЙ.
ШЧАСЛІВА, А НЕ ШЧАЛІВАЦЬ.
ШЧАСЛІВА: Ш-Ч-А-С-Л-І-В-А.
БОЛЬШ НІЯКАГА ДОЎГА І ШЧАСЛІВА.
"БОЛЬШ НІЯКАГА ДОЎГА І ШЧАЛІВАЦЬ" – ГЭТА НЕЙКАЯ БЯЗГЛУЗДЗІЦА. НАВАТ ДЛЯ ХЛОПЦА, У ЯКОГА ЖУКІ НА АБЕД.
БОЛЬШ НІ
Я НЕ ЗМОГ СТРЫМАЦЦА І З'ЕЎ АДНУ МУХУ ПАСЛЯ СТА ГАДОЎ НАРМАЛЬНЫХ ЧАЛАВЕЧЫХ ЗВЫЧАК – І ВОСЬ, ЗАПЭЦКАНЫ НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ.
ВЫДАТНА!
Я ДУМАЮ, УСЁ. Я ДУМАЮ, ШТО МЫ СКОНЧЫЛІ.
...ЯКАГА ДОЎГА І ШЧАСЛІВА
ДЫК КОЛЬКІ КРЫВІ МЫ ВЫКАРЫСТАЛІ?


ВЕСТЫБЮЛЬ ВУДЛЭНД.
5 дзён да Дня Памяці квіткі яшчэ не распрададзены
ПРАЧНІСЯ, ГРЫМБЛ.
ПРАБАЧ, ШТО ПЕРАРЫВАЮ ПЕРШУЮ Ў ТВАІМ ЗАБОЙНЫМ РАСКЛАДЗЕ ДРЫМОТУ, АЛЕ МНЕ ПАТРЭБНЫЯ КЛЮЧЫ АД КАМЕРЫ ДЛЯ ЗАТРЫМАНЫХ.
НАВОШТА?
ЧАС ЗАТРЫМАНАМУ ПАДСІЛКАВАЦЦА.
ФАЙЛЫ
ІЗНОЎ? ВЫ СПРАБУЕЦЕ ВЫКАРМІЦЬ ЯГО НА ЗАБОЙ? КАЛІ ВЫ ЗБІРАЕЦЕСЯ АБЫХОДЗІЦЦА З ВЯЗНЯМІ ДОБРА, ТО Я ЖАДАЮ БЫЦЬ НАСТУПНЫМ.
ПРА ШТО ТЫ КАЖАШ?
ЯГО СВЕТЛАСЦЬ ГНАЯВЫХ КУЧ ПРЫНЁС ВАШАМУ ХЛОПЦУ ВЫДАТНЫ АБЕД. ДЗЕСЯЦЬ ХВІЛІН ТАМУ. СМАЖАНАЯ КУРЫЦА З ЧАСНАКОМ, КАЛІ МОЙ НОС НЕ ХЛУСІЦЬ.
ХТО ГЭТА БЫЎ?
СІНЯЯ БАРАДА. УЛАСНАЙ КАРАЛЕЎСКАЙ ПЕРСОНАЙ. ВОСЬ ХТО. ЁН КАЗАЎ, ШТО ВЫ ЯМУ ДАЗВОЛІЛІ.
У ЛЮБЫМ ВЫПАДКУ КАЛІ ВАМ СПАТРЭБІЦЦА КЛЮЧЫ, ВАМ ТРЭБА БУДЗЕ ЗАБРАЦЬ У ЯГО, БО ЁН ІХ ЯШЧЭ НЕ ВЯРНУЎ.
ХАЛЕРА!
ПЧЕЛА БИЛЛИ ГАМБУРГЕРЫ



Я НІЧОГА НЕ РАБІЎ ЁЙ!
ТЫ МОЖАШ ТАКСАМА ЎСЁ РАСПАВЕСЦІ ЗАРАЗ, ХЛОПЧА. Я МАЮ НАМЕР РЭЗАЦЬ ЦЯБЕ ЎВЕСЬ ДЗЕНЬ І ЎСЮ НОЧ, ПАКУЛЬ ТЫ НЕ ПРЫЗНАЕШСЯ.
КАЖЫ ЗАРАЗ – І ТЫ ЗМОЖАШ ПАЗБЕГНУЦЬ БОЛІ.
КІНЬ НОЖ І АДЫДЗІ АД ХЛОПЦА...



... ЦІ Я ПАРВУ ТВАЮ ГЛОТКУ.
ОХ, ПАГЛЯДЗІЦЕ! ПАСЛЯ ЎСІХ ГЭТЫХ ГАДОЎ ВОЎК НАРЭШЦЕ ЗБРОСІЎ СВОЙ АВЕЧЫ ГАРНІТУР І ПАКАЗАЎ СВОЙ САПРАЎДНЫ ТВАР.
БОЛЬШАСЦЬ З НАС ВЕДАЛІ, ШТО ГЭТА ПЫТАННЕ ЧАСУ, ПАКУЛЬ ТЫ ВЕРНЕШСЯ ДА БЫЛОГА ЖЫЦЦЯ, БОЗЛІ. НАТУРУ НЕ ПЕРАГУЛЯЦЬ.


ЗАБЕЙ ЯГО БОЗЛІ! ЦІ ЁН ЗАБ'Е МЯНЕ!
НОНСЭНС. КАЛІ Б Я СПРАБАВАЎ ЗАБІЦЬ ЯГО, ЁН БЫЎ БЫ МЁРТВЫ.
Я МАЮ НАМЕР НЕ ЗАБІВАЦЬ ЯГО, ПАКУЛЬ Я НЕ ВЫРАЖУ ПРАЎДУ З ЯГО.
СЫДЗІ ЯШЧЭ НА ГАДЗІНКУ, ВОЎК – І МАЛАДЫ ДЖЭК БУДЗЕ ПРАСІЦЬ ШАНЕЦ РАСПАВЕСЦІ НАМ, ШТО ЁН ЗРАБІЎ З РУЖАЙ, І ДЗЕ МЫ МОЖАМ ЗНАЙСЦІ ЯЕ... ЦІ ЯЕ ЦЕЛА.
МЫ БОЛЕЙ ГЭТАГА НЕ РОБІМ.
АДЫДЗІ АД ЯГО, СІНЕБАРОД. КАЛІ Я ПАДНІМУ НА ЦЯБЕ РУКІ – ГЭТА НЕ СКОНЧЫЦЦА, ПАКУЛЬ АДЗІН З НАС НЕ БУДЗЕ МЁРТВЫ.
І ШТО? ТЫ УЯЎЛЯЕШ, ШТО БУДЗЕШ ПЕРШЫМ З ТВАЙГО ВІДУ, КАГО МНЕ ТРЭБА БУДЗЕ ЗАБІЦЬ? Я СТАГОДДЗЯМІ ТРЫМАЎ СВАЕ ЗЕМЛІ ЧЫСТЫМІ АД ГЭТАЙ ГІДОТЫ.
СТАЎЛЮ НА ТОЕ, ШТО ЗАЎСЁДЫ З БЯСПЕЧНАЙ АДЛЕГЛАСЦІ ДЗІДЫ...
...І З МНОСТВАМ УЗБРОЕНЫХ ЛЮДЗЕЙ КАЛЯ ЦЯБЕ, КАБ ЗБЕРАГЧЫ АД САПРАЎДНАЙ НЕБЯСПЕКІ.
ПАГЛЯДЗІМ, ЯК АТРЫМАЕЦЦА Ў ЦЯБЕ ЗАРАЗ, З АДНІМ ІКЛОМ.


АРГУМЕНТ ПРЫНЯТЫ. АЛЕ ТЫ НІЯК НЕ ЗМОЖАШ ДАБРАЦЦА ДА МЯНЕ ПЕРАД ТЫМ, ЯК Я ПЕРАРЭЖУ ГЛОТКУ ГЭТАЙ ШЭЛЬМЕ.
ТЫ НЕ ЖАДАЕШ РАБІЦЬ ГЭТАГА!
БУДЗЬ МАІМ ГОСЦЕМ. Я ЖАДАЮ ЗНІШЧЫЦЬ ГЭТУ ПАГРОЗУ Ў МАІМ ЖЫЦЦІ.
БОЗЛІ! НЕ ТРЭБА ЯМУ ДАВАЦЬ ІДЭІ! ЁН ПРОСТА ЖАРТУЕ, СІНЕБАРОД. НЕ СЛУХАЙ ЯГО. НА САМАЙ СПРАВЕ ЁН ВЕЛЬМІ МЯНЕ ЛЮБІЦЬ.
А ПОТЫМ Я ЦАЛКАМ ПРАВАМЕРНА ЗАБ'Ю ЦЯБЕ...
ПАСТОЙЦЕ! АБОДВА! МЫ НЕ ЖАДАЕМ ДАМОВІЦЦА ДА НЕАБДУМАНЫХ ДЗЕЯННЯЎ.
ДАВАЙЦЕ АДСТУПІМ, ГЛЫБОКА ЎЗДЫХНЁМ, АБВЯСЦІМ ХВІЛІННЫ МАРАТОРЫЙ НА БІЦЦЁ КУЛАКАМІ Ў ГРУДЗІ І ПАГЛЯДЗІМ, ЦІ НЕ МОЖАМ МЫ РАЦЫЯНАЛЬНЕЙ УСЁ АБДУМАЦЬ. ДОБРА?
ХЛОПЦЫ?
ХУТЧЭЙ!


ПАДЫМІ МАЕ ЧАРАВІКІ, ДЖЭК.
ТЫ МАЖЛІВА НЕ ЗАЎВАЖЫЎ, ШТО Я СПЛЫВАЮ КРЫВЁЙ? МНЕ ПАТРЭБНЫ ДОКТАР.
НЕБАРАКА.
УХ ТЫ!
ОЙ!
ДЗЕ ПАЖАР, ДЗЕТКІ?
МЫ ШЛІ РАТАВАЦЬ ЦЯБЕ.
МАЯ ГЕРАІНЯ.
ТУТ КАМУСЬЦІ ПАТРЭБНЫ ДОКТАР, Я СПЛЫВАЮ КРЫВЁЙ.
СУПАКОЙСЯ, ДЖЭК, У ЦЯБЕ ЎСЁ ДОБРА.
ДЖОН, ЦІ НЕ МАГЛІ Б ВЫ З ГРЫМБЛАМ ДЖЭКА І ВЫКАРЫСТАЦЬ АПТЭЧКУ КАЛЯ СТАЛА? А ПОТЫМ АДВЯДЗІЦЕ ЯГО ДАДОМУ І ПЕРАКАНАЙЦЕСЯ, ШТО ЁН НІКУДЫ АДТУЛЬ НЕ СЫДЗЕ.
ДЗЕ СІНЕБАРОД?


ЁН ВЫЗВАЎСЯ ЗАНЯЦЬ МЕСЦА ДЖЭКА Ў ТУРМЕ. Я СПАДЗЯЮСЯ, КАМЕРА ЯМУ ПАДАБАЕЦЦА. ЯМУ ТАМ СЯДЗЕЦЬ ЯШЧЭ ШМАТ.
ЁН КАТАВАЎ ДЖЭКА, КАЛІ Я ПРЫЙШОЎ.
НАВОШТА?
НАПЭЎНА ЁН ПАВЕРЫЎ НАЙБОЛЬШ ЖОРСТКІМ ЧУТКАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ЗДАРЫЛАСЯ З РУЖАНЬКАЙ.
ШТО ТЫ ЗБІРАЛАСЯ РАБІЦЬ З ГЭТЫМ ВЯЛІЗАРНЫМ МЯЧОМ?
ДАПАМАГАЦЬ ТАБЕ.
Я УСЦЕШАНЫ, АЛЕ ДОБРА, ШТО ТЫ НЕ ПРЫЙШЛА РАНЕЙ. СІНЕБАРОД НАСТОЛЬКІ МАЙСТЭРСКІ МЕЧНІК, НАКОЛЬКІ ТЫ НЕ.
ЁН МОГ БЫ АДАБРАЦЬ ГЭТУ РЭЧ І ЗРАБІЦЬ ДРЭННА НАМ АБОДВУМ.
НЕ РАНЕЙ, ЧЫМ Я Б АДЗІН РАЗ ДОБРА РЭЗАНУЛА ЯГО. І ГЭТАГА БЫЛО Б ДАСТАТКОВА. ГЭТА ЗНАКАМІТЫ БАРМАГЛОТАМ, ЗАБІВАЕ ЗА АДЗІН УДАР. МЕЧ ДЛЯ ХАТНІХ ГАСПАДЫНЬ? САМ ВАЮЕ ЗА ЦЯБЕ?


ОХ, ЦУДОЎНА. ТАДЫ НЕ НАСІ ЯГО ТАКІМ ЧЫНАМ, БО АДСЯЧЭШ САБЕ ГАЛАВУ. ТЫ МНЕ ПАТРЭБНА ЦАЛКАМ НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ НА ВЯЛІКАЙ ВЕЧАРЫНЕ.
ПРАБАЧ?
НУ Я БУДУ ВЕЛЬМІ ДЗІЎНА ВЫГЛЯДАЦЬ, ЦЯГАЮЧЫ З САБОЙ ЖАНЧЫНУ БЕЗ ГАЛАВЫ ПА БАЛЬНАЙ ЗАЛЕ.
КАЛІ ГЭТА МЫ ВЫРАШЫЛІ, ШТО Я ІДУ НА БАЛЬ З ТАБОЙ? І ЯШЧЭ ПЫТАННЕ – КАЛІ ТЫ ВЫРАШЫЎ ІСЦІ? ТЫ Ж ЗВЫЧАЙНА НЕ ХОДЗІШ НА ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ.
НЕ МАГУ ПАЗБЕГНУЦЬ ЯГО СЁЛЕТА. КАЛІ ЁСЦЬ НЕЙКІ ШАНЕЦ ВЫРАШЫЦЬ УСЁ, Я ПАВІНЕН БЫЦЬ ТАМ, А ТЫ ПАВІННА БЫЦЬ ТАМ ЯК МАЯ ПАРА.
УСЁ ГЭТА ВЕЛЬМІ СКЛАДАНА, І Я НЕ МАГУ РАСТЛУМАЧЫЦЬ ГЭТА. ТАМУ ТЫ ПРОСТА ПОЙДЗЕШ
ЗАРАЗ, КАЛІ ТЫ ВЫБАЧЫШ МНЕ, Я ПАВІНЕН ПАЙСЦІ ДАДОМУ І ПЕРААПРАНУЦ-ЦА.
ДЗЫНННЬ ДЗЫНННЬ
ПРЫТРЫМАЙЦЕ ПОРТКІ! Я ЗАРАЗ!
АЛЁ?
ZZZZZ
ШТО? АХ ТАК. ПРАБАЧ, Я БЫЎ ПА-ЗА ЗОНАЙ ДОСТУПУ АМАЛЬ УВЕСЬ ДЗЕНЬ.
ШТО ВЫ ВЫСВЕТЛІЛІ? ТАК, ДОБРА.


ЯШЧЭ НЕ. У МЯНЕ ДЛЯ ВАС ЁСЦЬ ЯШЧЭ АДНА ДРЭННАЯ НАВІНА. ВАМ ТРЭБА ПРЫБРАЦЦА, ШВАБРА, ВОСК, МЫЮЧЫЯ СРОДКІ І ФАРБА, ПАКУЛЬ УСЁ НЕ БУДЗЕ Ў ПЕРШАПАЧАТКОВЫМ СТАНЕ.
І ВАМ ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ ХУТКА, БО МЫ МОЖАМ ДАЗВОЛІЦЬ САБЕ АРЭНДНУЮ ПЛАТУ ТОЛЬКІ ЗА ДВА ДНІ.
КАЛІ СКОНЧЫЦЕ З ГЭТЫМ, ПАДНІМІЦЕСЯ Ў КВАТЭРУ РУЖАНЬКІ І ЗРАБІЦЕ ТАКСАМА ПРЫБОРКУ.
НЕ. МНЕ БОЛЕЙ НЕ ТРЭБА ЗАХОЎВАЦЬ ДОКАЗЫ.
УРЭШЦЕ ЗБЯРЫЦЕ ЗЛАМАНУЮ МЭБЛЮ З АБЕДЗВЮХ КВАТЭР НА ПАМЫЙНІЦУ І СПАЛІЦЕ.
І НЕ ДАЗВАЛЯЙЦЕ ЗВЫЧАЙНЫМ УБАЧЫЦЬ ВАС.
КАЛІ ЎСЁ ГЭТА ЗРОБІЦЕ-ІДЗІЦЕ ДАДОМУ.
АГА, НУ МАЁ СЭРЦА ЗБАЛЕЛАСЯ ПРА ВАС: КАЖУЦЬ, ШТО ЛЁГКА БЫЛО ТОЛЬКІ ЎЧОРА.


НЕКАЛЬКІ ГАДЗІН ПАЗНЕЙ...
БОЗЛІ, ДОБРА, ШТО ТЫ ЗАЙШОЎ ДА ТАГО, ЯК ПАЙШОЎ СПАЦЬ. ТЫ НЕ ПАВЕРЫШ, ЧЫМ ДЖЭК ЗАЙМАЎСЯ ЎВЕСЬ ГЭТЫ ЧАС.
ЗДАЕЦЦА, ШТО ДЖЭК БЫЎ УЛАДАЛЬНІКАМ DREAM-WORLDZ.COM.
ШТОСЬЦІ НАКШТАЛТ СТАРТАП-КАМПАНІІ ПА ПРЫГОДНІЦКІМ ТУРАМ, ЯКУЮ ЁН ПРАДВІГАЎ УЖО ГОД.
Я СПАДЗЯВАЎСЯ, ШТО ТЫ ЎЖО ПАЙШЛА ДАДОМУ, ТАМУ Я МАГУ АДКЛАСЦІ ГЭТА ДА РАНІЦЫ.
ГЭТА ДЖЭК МОГ СПРАБАВАЦЬ ЗАСЯДЛАЦЬ ХВАЛЮ ІСТЭРЫІ НАКОНТ УКЛАДАЎ У ІНТЭРНЭЦЕ ТОЛЬКІ ПАСЛЯ ТАГО, ЯК УСЕ ПАРАЗУМНЕЛІ Ў ГЭТЫХ СПРАВАХ.
ЗДАЕЦЦА, ШТО ЁН ЗГУБІЎ ШМАТ ГРОШАЙ НА СВАЁЙ АПОШНЯЙ "ХУТКА-РАЗБАГАЦЕЙ" СХЕМЕ.
БЭЛА, ТАБЕ ТРЭБА ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА ДРЭННАЙ НАВІНЫ.
АЛЕ ДЗЕ ДЖЭК УЗЯЎ ГРОШЫ, ЯКІЯ ЗГУБІЎ?
ШТО? ШТО ТЫ СКАЗАЎ?
У СЯРЭДНЕСТАТЫСТЫЧНАЙ ЖАНЧЫНЕ ЛЕДЗЬ БОЛЕЙ ЧАТЫРОХ ЛІТРАЎ КРЫВІ. НЕЗВАРОТНЫ ШОК, НАСТАЕ КАЛІ ЗГУБЛЕНА БОЛЕЁ ЧО АДСОТКАЎ ГЭТАГА АБ'ЁМУ.
Я ДАВЕДАЎСЯ, ШТО РУЖАНЬКА ЗГУБІЛА КАЛЯ 2,5 ЛІТРАЎ КРЫВІ.
АЛЕ...? НЕ, НЕ КАЖЫ ГЭТАГА...
ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ, ШТО БОЛЕЙ НЯМА НАДЗЕІ, ШТО РУЖА ЎСЁ ЯШЧЭ ЖЫВАЯ.
ПРАБАЧ.
ДАЛЕЙ: ДЭТЭКТЫЎНЫ РАМАН